му выконваць вывучаныя песні. Творчае імкненне дзяцей трэба заахвочваць і падтрымліваць, тым больш калі справа датычыцца народна-песеннага выканальніцтва. Імправізацыйнасць — выключна каштоўная якасць фальклору, якая з асаблівай яскравасцю выявілася ў музычным мастацтве. Засваенне традыцыйных фальклорных твораў з прымяненнем адпаведных музычных сродкаў садзейнічае фарміраванню выканальніцкай творчай дзейнасці дзяцей.

Народная песня развівае музычны свет дзіцяці, абуджае творчыя здольнасці. У дзіцячым выхаванні і адукацыі народная песня мае вялікае значэнне. І безумоўна, што адной з найбольш даступных форм далучэння дзяцей да народнай песні з'яўляецца народна-харавое мастацтва спеваў. У дзіцячых харавых калектывах народная музыка займае ганаровае месца.

Харавое мастацтва — важны шлях актывізацыі дзіцяці, раскрыцця творчых бакоў яго асобы, інтэлектуальнага, эстэтычнага, эмацыянальнага. Калектыўнае творчае выканальніцтва вядзе да павелічэння ўстойлівасці музычных інтарэсаў і патрэбнасцей, узбагачэння іх.

Такім чынам, з дапамогай разнастайных і арганічна спалучаных паміж сабой сродкаў дзеці ўцягваюцца ў творчы працэс работы над народнай песняй. Метады асваення фальклору шматлікія і невычарпальныя, як сама народная творчасць. Далучэнне дзяцей да гэтай жыватворнай крыніцы з'яўляецца сур'ёзным укладам у эстэтычнае выхаванне, спрыяе павышэнню творчай актыўнасці. У апошнія гады дзіцячыя народныя хары і фальклорныя ансамблі сталі з'яўляцца на базе агульнаадукацыйных і музычных школ, дамоў дзяцей і юнацтва, харавых студый.

Бесперапынны рост па колькасці даказвае жыццяздольнасць такой формы асваення нацыянальных традыцый, а патрэбнасць вывучэння вопыту гэтых калектываў — відавочная.

**М. Л. КУЗЬМІНІЧ**, канд. пед. навук (Беларускі універсітэт культуры)

## ДА ПЫТАННЯ АБ СПЕЦЫФІЦЫ ПАДРЫХТОЎКІ МУЗЫКАНТАЎ У БЕЛАРУСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ КУЛЬТУРЫ

Мінскі інстытут культуры ўзнік у 1975 г. як установа, што павінна была забяспечыць клубы і бібліятэкі рэспублікі спецыялістамі вышэйшай кваліфікацыі. Факультэт культурна-асветніцкай работы, у прыватнасці, рыхтаваў кіраўнікоў самадзейных аркестравых і харавых калектываў. Іх спецыяльная падрыхтоўка ўключала ў сябе не толькі музычныя тэарэтычныя і практычныя прадметы, але і дысцыпліны клубазнаўчага цыкла (гісторыя, тэорыя, методыка і арганізацыя культурна-асветніцкай работы і інш.). Цыкл псіхолага-педагагічных дысцыплін таксама быў значна прадстаўлены ў вучэбным плане, што тлумачылася спецыфікай работы з самадзейнымі мастацкімі калектывамі. Так, у 5-гадовым 1988 г. вучэбным плане інстытута культуры на педагогіку адводзілася 71 гадзіна, а на псіхалогію — 109. Сюды можна дадаць і шэраг раздзелаў і тэм з клубазнаўчых і спецыяльных курсаў, што павялічвала агульную колькасць гадзін амаль удвая. Для параўнання: кансерваторскім планам таго часу



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на вывучэнне прыватных методык педагогікі і псіхалогіі прадугледжвалася 140 гадзін.

Карэнныя змены ў грамадстве прымусілі ўнесці пэўныя карэктывы ў мэты і задачы дзейнасці інстытута культуры, змест падрыхтоўкі спецыялістаў для сацыяльна-культурнай сферы. На аснове аналізу сацыяльна-культурных працэсаў у краіне Міністэрства культуры ў якасці асноўнага напрамку ў рабоце факультэта мастацкай творчасці прапанавала арганізаваць падрыхтоўку нацыянальных кадраў для аматарскага мастацтва, якія (як адзначалася ў даведцы адной з камісій Міністэрства) “павінны ісці на работу ў клуб, арганізоўваць вольны час насельніцтва, а не імкнуцца ўладкавацца на працу ў ДМШ і філарманічныя калектывы”.

Цяжка пагадзіцца з такім абмежаваннем магчымага поля дзейнасці выпускнікоў мастацкіх спецыялізацый, бо аналіз практыкі адвяргае падобны падыход у падрыхтоўцы кадраў. Студэнт інстытута імкнецца атрымаць такую адукацыю, якая магла б забяспечыць яму паспяховае выкананне прафесійных абавязкаў не толькі ў якасці кіраўніка клубнага аматарскага калектыву, але і ў якасці канцэртмайстра, музыканта-выканаўцы, музычнага выхавацеля і выкладчыка ў дзіцячым садку, агульнаадукацыйнай і музычнай школах. Гэта асабліва важна ва ўмовах магчымага беспрацоўя, нізкага матэрыяльнага забеспячэння работнікаў культуры.

Акрамя таго, вызначэнне асноўных накірункаў у падрыхтоўцы кадраў для асобных навучальных устаноў звязана з імкненнем вырашыць пытанне аб дынамічным развіцці і ўзаемадзеянні ўсіх трох форм мастацтва — прафесійнага, аматарскага (мастацкая самадзейнасць) і традыцыйнага (аўтэнтычнага).

Інстытут культуры, які да апошняга часу быў “замацаваны” за аматарскай культурай і займаўся падрыхтоўкай кіраўнікоў калектываў мастацкай самадзейнасці, апынуўся ў складанай сітуацыі. Бо мастацкая самадзейнасць у сваёй масе разглядалася як альтэрнатыва традыцыйнай культуры і за ўзор развіцця брала прафесійныя калектывы, несла на сабе цяжар ідэалагізаванасці, фармалізму і заарганізаванасці. Сёння ў такім выглядзе яна аказалася нежыццяздольнай, бо парывалася сувязь з народнай традыцыйнай культурай. Гэтая сувязь адсутнічала і на ўзроўні падрыхтоўкі спецыялістаў. Думаецца, мы тут пажынаем плады стварэння так званай “сацыялістычнай” культуры ў беларускім варыянце, з характэрнай для яе адсутнасцю нацыянальнай асновы музычнага выхавання ў сям’і, у дашкольных і школьных установах, у тым ліку і вышэйшых. Таму такім актуальным становіцца сёння аднаўленне сувязей паміж прафесійнай, аматарскай і традыцыйнай культурамі на ўзроўні падрыхтоўкі спецыялістаў, якія былі б здольнымі да працы ва ўсіх сферах культуры. Іншая справа, што кожны студэнт можа выбраць для сябе тую ці іншую галіну прафесійнай дзейнасці, а задача ўсіх ВНУ — стварыць яму ўмовы для больш грунтоўнай падрыхтоўкі ў вызначаным накірунку. Такім чынам, адстойваючы прынцып шырокай фундаментальнай падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музычнай культуры ў кожнай з навучальных устаноў, можна было б пагадзіцца і з пэўнай іх спецыялізацыяй, з вызначэннем прыярытэтных накірункаў у іх навуковай рабоце і падрыхтоўцы кадраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як ужо адзначалася, для інстытута культуры такім накірункам магла б стаць падрыхтоўка спецыялістаў для народнай культуры, што падкрэсліла б яго адметнасць у параўнанні з Акадэміяй музыкі. Адпаведна, выпускнікі інстытута мелі б яскрава акрэслены накірунак сваёй прафесійнай дзейнасці. Галоўным у іх падрыхтоўцы стала б не фарміраванне якасцей прафесійнага музыканта-выканаўцы, а веданне рэгіянальных фальклорных традыцый, пэўныя навыкі ў адраджэнні, падтрымцы, арганізацыі народнай (традыцыйнай) культуры. Зразумела, што асновай зместу падрыхтоўкі такіх спецыялістаў стала б грунтоўнае вывучэнне беларускага фальклору і ўсёй беларускай нацыянальнай культуры ўвогуле, што, аднак, не азначае нацыянальнай замкнёнасці. Наадварот, нацыянальная культура беларусаў павінна вывучацца ў параўнанні з развіццём народнай культуры краін-суседак, з далучэннем да каштоўнасцей сусветнай культуры.

Патрабуе свайго вырашэння і праблема, сутнасць якой — у існаванні пэўнага размежавання ў тэорыі і на практыцы паміж сістэмамі масавага музычнага выхавання і прафесійнай музычнай адукацыі. Гэтае размежаванне прысутнічае і ў дзейнасці ВНУ мастацтва і культуры, хоць аналіз іх работы сведчыць аб існаванні пэўных падстаў для ўстанаўлення больш шчыльных сувязей паміж імі. Маецца на ўвазе агульная мэта прафесійнай дзейнасці выпускнікоў гэтых навучальных устаноў — фарміраванне музычнай культуры грамадства. Імкненне жорстка замацаваць выпускнікоў розных ВНУ за канкрэтнымі школьнымі ці пазашкольнымі навучальнымі ўстановамі, на наш погляд, немэтазгодна. І само жыццё пра гэта сведчыць. Так, хоць ДМШ і лічацца першай прыступкай у сістэме прафесійнай музычнай адукацыі, але ўжо ў гэтым годзе яны прыступілі да работы з дзецьмі па двух паралельных планах, якія павінны забяспечыць агульную музычную адукацыю для адных навучэнцаў і прафесійную музычную арыентацыю для другіх. У якасці прыкладу можна прывесці і лепшыя агульнаадукацыйныя школы з музычна-харавым ухілам, якія па ўзроўні спецыяльнай падрыхтоўкі сваіх вучняў не саступаюць ДМШ.

На наш погляд, атрыманая выпускнікамі інстытута адукацыя павінна быць у такой жа ступені глыбокай, як і шырокай. Таму абмежаванне іх дзейнасці толькі сферай музычнага выхавання ці народнай культуры, работай у клубных установах азначае тым самым свядомае адмаўленне ад выкарыстання патэнцыяльных магчымасцей спецыялістаў у іншых сферах дзейнасці. Вызначаючы для інстытута культуры асноўны накірунак у падрыхтоўцы кадраў, трэба ў той жа час падтрымліваць яго захады па засваенні студэнтамі дадатковых кваліфікацый. Тым больш што пералік мастацкіх спецыялізацый інстытута не дазваляе яму цалкам упісацца ў сферу народнай (аматарскай) культуры: толькі тут могуць атрымаць вышэйшую кваліфікацыю харэографы, харавікі-народнікі і эстрадныя музыканты. Пэўнае "дубліраванне" ў падрыхтоўцы кадраў можна заўважыць і ў дзейнасці Магілёўскага філіяла Акадэміі музыкі і музфака былога МДПІ. Такім чынам, гаворка павінна ісці перш за ўсё пра каардынацыю дзейнасці трох азначаных вышэй навучальных устаноў у справе музычна-педагагічнай і спецыяльнай падрыхтоўкі спецыялістаў. Менавіта такі падыход характэрны для многіх заходніх краін, дзе хоць і адсутнічае жорсткае кіраванне ВНУ з боку міністэрства і адзінства ў вучэбных планах, але ж агульнай тэндэнцыяй з'яўляецца імкненне да уніфікацыі вы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шэйшай музычна-педагагічнай адукацыі. Калі музычныя факультэты універсітэтаў рыхтуюць настаўнікаў музыкі для пачатковых класаў агульнаадукацыйных школ, то выпускнікі вышэйшых навучальных музычных устаноў працуюць і ў старэйшых класах агульнаадукацыйных школ, і ў якасці прыватных настаўнікаў, у прафесійных і аматарскіх калектывах. Цяжка прыгадаць навучальную ўстанову, якая б рыхтавала толькі кіраўнікоў самадзейных калектываў.

Устанаўленне сувязей паміж ВНУ пакуль што ідзе стыхійна, на ўзроўні асобных выкладчыкаў. Так, некаторыя з іх працавалі ці працуюць зараз адначасова ў дзвюх установах. Але гэтыя кантакты трэба ўзняць на новы, больш высокі ўзровень — узровень узгаднення вучэбных планаў і праграм, распрацоўкі метадычнага забеспячэння асобных курсаў, правядзення сумесных тэарэтычных даследаванняў. Першыя крокі ў гэтым накірунку робяцца, да прыкладу, выкладчыкамі курса "Беларуская народна-інструментальная культура". Карысная стала б такая работа і ў галіне музычна-педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў.

Сённяшняя педагагічная падрыхтоўка студэнтаў у інстытуце набывае ўсё большую грунтоўнасць і практычную скіраванасць. У вучэбным плане значацца псіхалогія (агульная — 60 гадзін, узроставая і педагагічная — 28, мастацкай творчасці — 30, сацыяльная — 26), педагогіка (агульная — 60, музычная — 40, тэатральная — 40 гадзін), прыватныя методыкі выкладання, спецкурсы, педагагічная практыка. На кафедры народна-інструментальнай творчасці педагагічная практыка праводзіцца ў VII—X семестрах на малодшых курсах сваёй і паралельных спецыялізацый, у музычных школах і студыях, у агульнаадукацыйных школах з музычна-харавым ухілам. У адпаведнасці з праграмай практыкі кожны семестр студэнты здаюць залік, які праходзіць у два этапы: на першым практыканты праводзяць фрагмент адкрытага ўрока, аналізуюць адзін з твораў педагагічнага рэпертуару, чытаюць яго з ліста; на другім прадстаўляюць вызначаныя дакументы — дзённік, характарыстыкі на свайго вучня і творчы калектыў, пісьмовыя аналізы наведаных урокаў і арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу ў адной з навучальных устаноў культуры і мастацтва. У канцы педагагічнай практыкі здаецца экзамен у форме абароны рэферата па музычнай педагогіцы. Акрамя педагагічнай практыкі без адрыву ад навучальнага працэса існуе і выязная вытворчая практыка — месячная на чацвёртым курсе і трохмесячная на пятым, у час якой студэнты таксама выконваюць заданні па педагагічнай практыцы. Для атрымання кваліфікацыі "Выкладчык" студэнту трэба выканаць шэраг умоў: усе дысцыпліны псіхолага-педагагічнага цыкла, экзамены па спецінструменце за ўвесь час навучання, а таксама дзяржаўныя экзамены вытрымаць з ацэнкай не ніжэй, чым "добра". У перспектыве плануецца экзамен па спецыяльнай педагагічнай падрыхтоўцы ўзвесці ў ранг дзяржаўнага. У планах інстытута і стварэнне сектара педагагічнай практыкі.

Такім чынам, структура спецыяльнай педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў у інстытуце шмат у чым падобная да пастаноўкі гэтай справы ў Акадэміі музыкі. Правядзенне сумесных пасяджэнняў, канферэнцый, творчых справаздач на ўзроўні асобных кафедр і факультэтаў дазваліла б абмяняцца вопытам, станоўча паўплывала б на вырашэнне агульных для ўсіх ВНУ задач.